Мэта вэб-квэста – цікава і займальна замацаваць веды вучняў 4 класа па тэме «Абагульненне па раздзеле «Чалавек і Радзіма», фарміраваць у іх пачуццё патрыятызму і гонару за сваю краіну.

Задачы: адукацыйная: замацаваць веды вучняў IV класа па тэме «Абагульненне па раздзеле «Чалавек і Радзіма»; выхаваўчая: садзейнічаць выхаванню ў вучняў пачуцця патрыятызму і гонару за сваю краіну; развівальная: узбагачаць слоўнік вучняў [3].

Пасля правядзення сістэматычнай работы з выкарыстаннем распрацаванага адукацыйнага вэб-квэста і выкарыстаных ў ім Інтэрнэт-рэсурсаў узровень ведаў сфарміраванасці патрыятычнай культуры вучняў павысіўся: высокі ўзровень – на 13 % , сярэдні зменшыўся на 8 %, а нізкі – на 5 %.

Такім чынам, сэрвісы Web 2.0 з'яўляюцца эфектыўным інструментам фарміравання патрыятычнай культуры, любові да Радзімы, яе гісторыі і герояў, а таксама захавання нацыянальных традыцый і спадчыны.

Літаратура:


1. Традиции суверенной Беларуси [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://president.gov.by/ru/belarus/traditions. – Дата доступу : 30.09.2024.
2. Астрэйка А. Г. Прадстаўніцтва беларускіх музеяў у віртуальнай прасторы / А.Г. Астрэйка // Весн. Беларус. Дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2015. – № 1. – С. 157–164.
3. Зубко, Д. П. Сучасныя аспекты выхавання патрыятызму і грамадзянскасці / Д. П. Зубко // Праблемы выхавання. – 2005 – № 1 – С. 12–16.


# ГІСТОРЫЯ МАГІЛЁВА: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ


**Якаўлева А. П.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.


Мэтай дадзенай працы з’яўляецца вывучэнне культурнай спадчыны малой Радзімы.

Магілёў – гэта абласны цэнтр Беларусі, які вырас на берагах ракі Днепр. Тут змяшаліся традыцыі і культура многіх пакаленняў. Гэта горад, які, быццам каштоўная скарбонка, захоўвае мноства таямніц і цікавых гісторый. Сваю гісторыю Магілёў пачынае з 1267 года. Існуе некалькі версій, чаму горад назвалі менавіта Магілёвам. Адна з асноўных звязана з імем галіцкага князя Льва Данілавіча Могія. У 1267 годзе галіцкі князь Леў Данілавіч Могій загадаў пабудаваць тут замак. Сюды пачалі з'язджацца рамеснікі, рыбакі і гандляры. Толькі вось ніякіх пацверджанняў існавання гэтага замка няма, а ў адной з памятных кніг Магілёўскай губерні ёсць паданне, якое звязвае заснаванне



Рэпазіторый ГрДМУ

горада не з будаўніцтвам замка, а з узвядзеннем царквы. Ёсць іншая версія паходжання назвы Магілёў. Згодна з ёй, імя горад атрымаў ад полацкага князя Льва Уладзіміравіча. Ёсць і трэцяя версія, якую апеў у сваім творы «Магіла льва» Янка Купала. У дрымучым лесе, на месцы цяперашняга Магілёва быў разбойніцкі прытон. Кіраваў бандытамі Машэка – чалавек незвычайнай сілы, які мог вырываць дрэвы з коранем. Спачатку ён быў мірным селянінам, але калі баярын адабраў у яго каханую нявесту, узбунтаваўся. Ён стаў разбойнічаць на баярскіх землях, помсціць за прычыненую крыўду. Загінуў волат ад рукі той самай прыгажуні, якую ён так кахаў і якая стала баярскай жонкай. Не захацела яна мяняць багатыя палаты на разбойніцкі прытон і забіла былога каханага. Просты народ пахаваў волата на высокім беразе Дняпра. А каб не згубілася месца пахавання, людзі насыпалі над магілай высокі курган. З часам сталі называць гэтае месца «Магілай Льва», а горад, што паўстаў паблізу – Магілёвам. Гару ж, на якой пахавалі Машэку, назвалі Машакоўскай або Машакоўкай. Зараз на Машакоўцы размешчаны адзін з мікрараёнаў горада – Юбілейны.

Да XIII стагоддзя гісторыя горада была цесна звязана з асноўнымі гандлёвымі шляхамі, адным з якіх быў знакаміты шлях «з варагаў у грэкі». Магілёў быў невялікім і неразвітым горадам, але ён змяніўся ў XIV стагоддзі, калі ўвайшоў у склад ВКЛ. Люблінская ўнія 1526 года зрабіла Магілёў часткай Рэчы Паспалітай. Магдэбурскае права горад атрымаў у 1577 годзе. Росквіт горада трапіў на цяжкі час: ішлі крывавыя войны паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам. Магілёў заўсёды апынаўся на шляху маскоўскага войска. Горад разбуралі і спальвалі, рабавалі яго жыхароў.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай Магілёў стаў часткай Расійскай імперыі, цэнтрам спачатку Магілёўскай правінцыі, а потым – Магілёўскай губерні. Вайна 1812 года таксама не абмінула Магілёў бокам. Недалёка ад горада адбылася легендарная бітва корпуса генерала Мікалая Раеўскага і французскіх сіл пад камандаваннем маршала Луі-Нікаля Даву пад вёскай Салтанаўка, у памяць аб якой пасля пераможнага заканчэння вайны быў узведзены помнік.

Вялікая Айчынная вайна прынесла гораду шмат гора і разбурэнняў. Магілёў абараняўся з 3 па 26 ліпеня 1941 года. Цяжкія баі ішлі ў пасёлку Буйнічы, прадмесці горада. Немцы страцілі тут не толькі значныя сілы, але і каштоўны час. У памяць аб гераічных баях у пасёлку Буйнічы адкрыты мемарыяльны комплекс абаронцам Магілёва «Буйніцкае поле». Мемарыял прызнаны культурнай каштоўнасцю Беларусі. У перыяд бітвы на Буйніцкім полі пад Магілёвам знаходзіўся ваенны карэспандэнт газеты «Известия», пісьменнік Канстанцін Сіманаў. Убачанае так узрушыла яго, што ён апісаў усе гэтыя падзеі ў рамане «Живые и мёртвые». Пасля смерці вялікі пісьменнік завяшчаў развеяць свой прах над Буйніцкім полем. Цяжка прыйшлося Магілёву ў гады акупацыі. Больш за 70 тысяч савецкіх грамадзян загінула ў горадзе, каля 30 тысяч магілёўцаў былі вывезены ў Германію, прыкладна 12 тысяч яўрэяў забіта. Горад быў вызвалены 28 чэрвеня 1944 года. Зараз Магілёў-сучасны і

Рэпазіторый ГрГМУ

вельмі прыгожы горад з вялікай колькасцю славутасцяў. Горад пачынаецца з вакзала, будаўніцтва якога пачалося па асабістым распараджэнні Мікалая II у 1900 годзе. У гады Першай сусветнай вайны на чыгуначнай станцыі Магілёва праходзіў службу ваенны санітар, паэт Сяргей Ясенін. Сёння ля ўваходу ў залу чаканняў падарожнікаў сустракае скульптура станцыйнага наглядчыка. Фуражка з кукардай, гадзіннік на ланцужку і ліхтар – як стагоддзе таму.

У цэнтры горада знаходзіцца найстарэйшы ў Беларусі Магілёўскі абласны драматычны тэатр, які быў пабудаваны ў 1888 годзе ў неарускім стылі з чырвонай цэглы. Магілёўскі тэатр адзін з лепшых у Еўропе па якасці акустыкі. Тут спяваў Фёдар Шаляпін, іграла Вера Камісаржэўская, свае творы выконваў Сяргей Рахманінаў. Спектаклі наведвалі Янка Купала і Якуб Колас.

У Магілёве ёсць свая Трыумфальная арка, якая была ўзведзена ў 1780 годзе да прыезду ў горад імператрыцы Кацярыны II. Тут імператрыца і аўстрыйскі імператар Іосіф II вырашалі лёс Рэчы Паспалітай.

Сімвалам горада лічацца Плошча Славы і гарадская ратуша. Вежу пабудавалі ў 1578 годзе, калі гораду было падаравана Магдэбургскае права. Ратуша адноўленая ў 2008 годзе.


Літаратура:

1. Могилёв. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://topbelarus.com/country/cities/mogilevskaya-oblast/mogilev/. – Дата доступа: 21.09.2024.
2. История Могилёва. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://mogilew.by/histor/162104-perekrestki-mogilevskoy-istorii-stanovlenie-goroda-xx-vek.html. – Дата доступа: 13.09.2024.


## БЕЛАРУСКАЯ БЕЗЭКВІВАЛЕНТНАЯ ЛЕКСІКА (У СУПАСТАЎЛЕННІ З ЛЕКСІКАЙ РУСКАЙ МОВЫ)


**Янкелайць Д. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Хлусевіч І. М.


Пры супастаўленні нават блізкароднасных моў у кожнай з іх можна выявіць словы, якія не маюць аднаслоўных сэнсавых эквівалентаў у другой мове. Такія словы называюць безэквівалентнай лексікай. Іх дакладнае значэнне на другую мову можа быць перададзена толькі апісальным спосабам. Напрыклад, беларускае слова *вырай* немагчыма перакласці на рускую мову адным словам, яго сэнс можна патлумачыць на рускай мове наступным чынам: *тёплые страны, куда летят зимовать перелётные птицы.*

Рэпазіторый ГрДМУ